# МЕЖДУНАРОДНЫЕ ОТНОШЕНИЯ В МЕЖВОЕННЫЙ ПЕРИОД И В ГОДЫ ВТОРОЙ МИРОВОЙ ВОЙНЫ: ВНЕШНЕПОЛИТИЧЕСКИЕ СВЯЗИ И МЕЖГОСУДАРСТВЕННЫЕ ПРОТИВОРЕЧИЯ

## УПЛЫЎ ПОЛЬСКА-ГЕРМАНСКАГА ДАГАВОРА АБ НЕНАПАДЗЕННІ 1934 г. НА САВЕЦКА-ПОЛЬСКІЯ АДНОСІНЫ 1934–1939 гг.

**В. М. Бароўская**

*Інстытут гісторыі НАН Беларусі, вул. Акадэмічная, 1, 220072, г. Мінск, Беларусь, borovskaya-olga@mail.ru*

Польска-германская дэкларацыя аб невыкарыстанні сілы 26 студзеня 1934 г. прывяла да росту напружанасці ў савецка-польскіх адносінах, адбылася змена курсу ад двухбаковага збліжэння да канфрантацыі. Паступовае ўзнаўленне Польшчы ў правах патэнцыйнага суперніка, якое нарастала напрацягу 1934 г., суправаджалася ўзмацненнем савецкага ціску на паўночным флангу «ўсходняга бар'ера». Стаўка на дэстабілізацыю пасляваеннага ўрэгулявання ў рэгіёне, прамое і ўскоснае аспрэчванне законнасці суверэнітэта Польшчы над усходнімі землямі, скепсіс у адносінах да магчымасці незалежнага існавання балтыйскіх краін уступілі месца абароне тэрытарыяльнага статус-кво СССР.

***Ключавыя словы:*** дэкларацыя аб невыкарыстанні сілы; польска-германскія адносіны; савецка-польскія адносіны.

## ВЛИЯНИЕ ПОЛЬСКО-ГЕРМАНСКОГО ДОГОВОРА О НЕНАПАДЕНИИ 1934 г. НА СОВЕТСКО-ПОЛЬСКИЕ ОТНОШЕНИЯ 1934–1939 гг.

**О. Н. Боровская**

*Институт истории НАН Беларуси, ул. Академическая, 1, 220072, г. Минск, Беларусь, borovskaya-olga@mail.ru*

Польско-германская декларация о неприменении силы 26 января 1934 г. привела к росту напряженности в советско-польских отношениях, произошла смена курса от двустороннего сближения к конфронтации. Постепенное восстановление Польши в правах потенциального соперника, нарастающее на протяжении 1934 г., сопровождалось усилением советского давления на северном фланге «восточного барьера». Ставка на

дестабилизацию послевоенного урегулирования в регионе, прямое и косвенное оспаривание законности суверенитета Польши над восточными землями, скепсис в отношении к возможности независимого существования балтийских стран уступили место защите территориального статус-кво СССР.

***Ключевые слова:*** декларация о неприменении силы; польско-германские отношения; советско-польские отношения.

## INFLUENCE OF THE POLISH-GERMAN NON-AGGRESSION TREATY OF 1934 ON SOVIET-POLISH RELATIONS 1934–1939

**O. N. Borovskaya**

*Institute of History, National Academy of Sciences, 1, Akademic Street, Minsk 220072, Republic of Belarus, borovskaya-olga@mail.ru*

The Polish-German declaration on the non-use of force on January 26, 1934 led to increased tension in Soviet-Polish relations, and there was a change in course in from bilateral rapprochement to confrontation. The gradual restoration of Poland's rights as a potential rival, which grew throughout 1934, was accompanied by increased Soviet pressure on the northern flank of the "eastern barrier". The focus on destabilizing the post-war settlement in the region, direct and indirect challenges to the legitimacy of Poland's sovereignty over the eastern lands, and possibility of the independent existence of the Baltic countries gave way to the defense of the territorial status quo of the USSR.

***Keywords:*** declaration on the non-use of force; Polish-German relations; Soviet-Polish relation.

У савецка-польскіх адносінах 1934–1939 гг. важнае значэнне набылі пытанні ўступлення СССР у Лігу Нацый і заключэння Усходняга пакта. У снежні 1933 г. ЦК УКП(б) прыняў пастанову аб разгортванні барацьбы за стварэнне сістэмы калектыўнай бяспекі ў Еўропе ў мэтах прадухілення пагрозы вайны і фашысцкай агрэсіі [1, с. 308]. Пры гэтым было прызнана магчымым уступленне СССР у Лігу Нацый і адначасовае падпісанне еўрапейскімі дзяржавамі рэгіянальнага дагавора аб абароне ад агрэсіі. Удзельнікамі рэгіянальнага Усходняга пакта павінны стаць СССР, Фінляндыя, Польшча, Чэхаславакія і прыбалтыйскія дзяржавы. Перагаворы аб Усходнім пакце працягвалася да канца 1934 г. У той час адбываліся размовы М. М. Літвінава з Ю. Бэкам у Жэневе. Але 9 кастрычніка 1934 г. міністр замежных спраў Францыі Л. Барту, прыхільнік уступлення СССР у Лігу Нацый і заключэння Усходняга пакта, памёр, што абцяжарыла палітычнае становішча. Пераемнік Л. Барту П. Лаваль шукаў магчымасці непасрэднай дамовы з Германіяй, што паслабіла б значэнне праекта Усходняга пакта.

Падпісанне 26 студзеня 1934 г. польска-нямецкай дэкларацыі аб ненападзенні і адмова польскага боку ад афармлення дамоўленасці з СССР аб незалежнасці краін Балтыі паклалі канец савецка-польскаму збліжэнню.

Хоць на XVII з’ездзе УКП(б) І. В. Сталін заявіў аб «пераломе да лепшага» ў адносінах СССР і Польшчы, далейшыя падзеі паказалі, што першы ў гісторыі двухбаковых адносін візіт польскага міністра замежных спраў СССР (люты 1934), наданне адпаведным місіям у Маскве і Варшаве ранга пасольстваў (сакавік 1934) і працяг на дзесяцігадовы тэрмін пакта аб ненападзенні (май 1934) сталі эпілогам непрацяглага збліжэння двух вядучых дзяржаў Усходняй Еўропы. Паступовае ўзнаўленне Польшчы ў правах патэнцыйнага суперніка, якое нарастала напрацягу 1934 г., суправаджалася ўзмацненнем савецкага ціску на паўночным флангу «ўсходняга бар’ера». Стаўка на дэстабілізацыю пасляваеннага ўрэгулявання ў рэгіёне, прамое і ўскоснае аспрэчванне законнасці суверэнітэта Польшчы і Румыніі над усёй тэрыторыяй гэтых дзяржаваў, скепсіс у адносінах да магчымасці незалежнага існавання Чэхаславакіі і балтыйскіх краін уступілі месца абароне тэрытарыяльнага статус-кво. З «усходняга бар’ера» краіны, размешчаныя паміж Чорным і Балтыйскімі марамі, пераўтвараліся для савецкага кіраўніцтва ў «заходні бар’ер», які абараняў СССР ад галоўнага цэнтра еўрапейскага канфлікта [2, с. 108–109].

Адмова Германіі прыняць прапанову па заключэнні пакта рэгіянальнай бяспекі, жаданне французскага кіраўніцтва ўзнавіць падрыхтоўку «Усходняга Лакарна» вярнулі савецкую дыпламатычную актыўнасць на шлях антырэвізіяніцкай палітыкі. У сярэдзіне мая 1934 г. главы знешнепалітычных ведамстваў Л. Барту і М. М. Літвінаў узгаднілі схему, у адпаведнасці з якой Германіі, Польшчы, Чэхаславакіі, Літве, Латвіі і Эстоніі прапаноўвалася заключыць з СССР рэгіянальную дамову аб узаемнай дапамозе ў выпадку агрэсіі аднаго з яго ўдзельнікаў (Усходні пакт). Францыя выступала гарантам выканання гэтай дамовы СССР і Германіяй, тады як СССР браў на сябе такі ж абавязак у выпадку парушэння Францыяй ці Германіяй Лакарнскага пакта. Па жаданні савецкага кіраўніцтва, французскі ўрад не толькі не прыняў на сабе абавязкі забяспечыць згоду з гэтым праектам гарантаў дагавора 1925 г. — Вялікабрытаніі і Італіі, але і весці перагаворы з плануемымі ўдзельнікамі Усходняга пакта. У канцы мая–пачатку чэрвеня 1934 г., калі французская дыпламатыя прыступіла да іх агалошвання, народны камісар замежных спраў узгадніў з румынскім і чэхаславацкім міністрам фармуліроўкі нот аб узаемным прызнанні, якімі яны абмяняліся як упаўнаважаныя сваіх урадаў. Абмен канфідэнцыяльнымі нотамі паміж СССР і Чэхаславакіяй зафіксаваў двайную адмову ад узаемных маёмасных прэтэнзій, звязаных з Першай сусветнай вайной і рэвалюцыяй.

Польская палітычная эліта зыходзіла з таго, што для захавання кантролю над «усходнімі крэсамі» нельга дапускаць умацавання пазіцый СССР у Еўропе. У дакументах Міністэрства замежных спраў Польшчы

снежня 1936 г. указвалася, што вайна магчымай кааліцыі з удзелам СССР супраць Германіі прывядзе не проста да падзення А. Гітлера, а выклікала бы ў Германіі камуністычную рэвалюцыю [1, с. 353]. У канцы 1930-х гг. захавалася зацікаўленасць савецкага кіраўніцтва ў наладжванні супрацоўніцтва з Польшчай у сувязі з ростам агрэсіўнасці Германіі. У прыватнасці гэту гатоўнасць павінна было пацвердзіць рашэнне Камінтэрна аб роспуску ў 1938 г. КПП і яе філіялаў КПЗБ і КПЗУ. Падчас сустрэчы з польскім паслом У. Гжыбоўскім 20 кастрычніка 1938 г. намеснік наркома замежных спраў СССР У. П. Пацемкін, пералічваючы фактары, якія адмоўна ўплываюць на савецка-польскія адносіны, не ўзгадаў пытанні, звязаныя з Заходняй Беларуссю і правамі нацыянальных меньшасцяў у Польшчы [3, с. 21].

Летам 1937 г. савецкі ўрад прапанаваў польскаму боку скараціць на тэрыторыі СССР колькасць польскіх консульстваў з мэтай ліквідацыі дыспрапорцыі паміж колькасцю польскіх консульстваў у СССР і савецкіх консульстваў у Польшчы. У адваротным выпадку ўрад СССР пагражаў дэнансаваць консульскую канвенцыю. У сярэдзіне 1938 г. пачаліся перагаворы аб гандлёвай дамове. Добразычлівая пазіцыя савецкага ўрада садзейнічала таму, што 19 лютага 1939 г. былі падпісаны «Дагавор і Дамова аб тавараабмене і разліках». Дэкрэтам Прэзідэнта Польшчы ад 11 сакавіка яны ўводзіліся ў дзеянне яшчэ да таго, як сейм разглядзеў праект закона аб іх ратыфікацыі. Паспяховасць гэта была абумоўлена развіццём міжнародных падзей.

Народны камісар замежных спраў СССР М. М. Літвінаў у размове з польскім паслом В. Гжыбоўскім 1 красавіка 1939 г. падняў пытанне аб магчымасці ўмацавання непасрэднага савецка-польскага супрацоўніцтва. Польскі бок даў негатыўны адказ аб яе ўдзеле ў шматбаковых дагаворах. 4 красавіка 1939 г. савецкі бок зноў паўтарыў свой запыт. Аднак польская пазіцыя не змянілася. У паведамленні ТАСС савецкае кіраўніцтва зноў нагадала аб жаданні распачаць супрацоўніцтва. Але Міністэрства замежных спраў Польшчы працягвала ўхіляцца аб больш цеснага супрацоўніцтва з СССР, зводзячы іх да бягучых адносін і дамаўляючыся на павелічэнне гандлёвых абаротаў. У польскім знешнепалітычным ведамстве лічылі, што абаснаванасць такой пазіцыі пацвярджаецца палітыкай Вялікабрытаніі ў адносінах да СССР: нягледзячы на шматлікія савецкія прапановы, ідэя супрацоўніцтва з ім разглядалася ў Лондане вельмі неспрыяльна [3, с. 22].

З пачатку мая 1939 г. план уцягнення Польшчы ў антыгітлераўскую кааліцыю стаў больш рэальным. Дэнансацыя А. Гітлерам польска-германскай дэкларацыі ад 26 студзеня 1934 г. рабіла немагчымым польска-германскую дамову, накіраваную супраць СССР. У гэтых абставінах адбыўся неафіцыйны візіт У. П. Пацемкіна 10 мая ў Варшаву. У размове з польскім

міністрам замежных спраў бакі не прышлі на пэўнай узгодненасці пазіцый. На заявы Пацемкіна, што Польшча ў выпадку нападзення з захаду зможа разлічваць на добразычлівую пазіцыю Савецкага Саюза, які не адмовіць ёй у дапамозе, калі яго папросяць аб гэтым. Ю. Бэк спасылаючыся на прынцыпы дагавора аб нейтралітэце, лічучы іх генеральным напрамкам міжнародных адносін. Гэтыя ж пытанні паралельна абмяркоўваліся В. Гжыбоўскім і народным камісарам замежных спраў В. М. Молатавым. Вызначаючы пазіцыю Польшчы ў адносінах да СССР, В. Гжыбоўскі сфармуляваў яе наступным чынам: Польшча не жадае ў цяперашні момант звязваць сябе якімі-небудзь дамовамі з СССР і адмаўляецца ад якіх бы то ні было савецкіх гарантый [4, с. 393–394].

Пункт гледжання ад непатрэбнасці польска-савецкага ваеннага супрацоўніцтва вызначыла і пазіцыю, занятую Польшчай падчас размоў з прадстаўнікамі генеральных штабоў Францыі і Вялікабрытаніі, якія адбываліся ў другой палове мая 1939 г. Інструкцыі Э. Рыдз-Сміглы не прадугледжвалі ніякай дамовы з СССР у выпадку ўзнікнення пагрозы ці ўзброенага канфлікта. Польскі план вайны прадугледжваў абарончыя дзеянні ў выпадку германскага ўдару і ўтрыманне пазіцый да моманту контрнаступлення Францыі і Вялікабрытаніі. У ходзе польска-англійскіх перагавораў абмяркоўвалася магчымасць атрымання рыштунку праз тэрыторыю СССР, але толькі ў плане тэхнічных магчымасцей перагрузкі на пагранічных станцыях. Такая пазіцыя Польшчы сыходзіла ад пазіцыі заходніх краін, у асаблівасці Вялікабрытаніі, у адносінах да савецкай прапановы аб стварэнні сумеснага антыгітлераўскага фронта [5, с. 68].

Мюнхенскага змова за кошт Чэхаславакіі, адхіленне савецкай ініцыятывы па стварэнні сістэмы калектыўнай бяспекі ўмацавалі ізаляцыю СССР і абвастрылі становішча ў Еўропе. Але ў гэтых умовах Вялікабрытанія, Францыя і Польшча працягвалі паўтараць былыя аргументы, які прывялі да таго, што не былі рэалізаваны ні Усходні пакт, ні ваенная канвенцыя, якая павінна была стаць дадаткам савецка-французскага дагавора 1935 г., ні рэформа Лігі Нацый. Гэтыя абставіны прымусілі савецкі ўрад прыняць меры па забяспячэнні бяспекі СССР перад тварам пагрозы вайны ў Еўропе. Гэта было падкрэслена ў дакладзе аб міжнародным становішчы і знешняй палітыцы СССР, які быў зроблены В. М. Молатавым за пасяджэнні III сесіі Вярхоўнага Савета СССР 31 мая 1939 г. Старшыня СНК заявіў, што інтарэсы СССР супадаюць з інтарэсамі міралюбівых краін і накіраваны на тое, каб стрымаць далейшае развіццё агрэсіі шляхам стварэння надзейнага і выніковага абарончага фронта міралюбівых дзяржаў. Адначасова ён падкрэсліў, што савецкая палітыка павінна клапаціцца аб тым, каб Савецкі Саюз не быў уцягнуты ініцыятарамі вайны ва ўзброены канфлікт

насуперак сваім жыццёвым інтарэсам. Для рэалістычнай палітыкі СССР, разам з імкненнем стварыць блок дэмакратычных дзяржаў, з’явілася альтэрнатыва — захаванне як мага болей доўга нейтралітэта ў непазбежным узброеным сутыкненні дзяржаў капіталістычнага лагера [6, с. 84–85].

Эпілогам стала развіццё падзей у ліпені–жніўні 1939 г. Вядомыя англа-франка-савецкія перагаворы пацвердзілі, што заходнія дзяржавы не схільныя заключыць з Савецкім Саюзам дагавор аб узаемнай дапамозе. Адмоўна сказалася на ходзе перагавораў і стан савецка-польскіх адносін. У такіх умовах 23 жніўня 1939 г. савецкі ўрад вырашыў заключыць з Германіяй дагавор аб ненападзенні, што даваў час для ўмацавання абароны краіны. Нападзенне фашысцкай Германіі на Польшчу 1 верасня 1939 г. стала пачаткам Другой сусветнай вайны. «Пакт чатырох», падпісаны 15 ліпеня 1933 г., стымуляваў развіццё савецка-польскіх адносін, аб’яднаў намеры бакоў па падрыхтоўкі да «Усходняга Лакарна», дазволіў вырашыць шматлікія спрэчныя моманты двухбаковых адносін, у прыватнасці, нармалізацыі існавання савецка-польскай мяжы і воднага суднаходства, культурнага збліжэння. Аднак схіленне польскай дыпламатыі да падпісання дагавора аб ненападзенні 1934 г. з Германіяй у сваю чаргу стала канцом агульнага пацяплення савецка-польскіх адносін, якое наступіла пасля падпісання савецка-польскага пакта аб ненападзенні ліпеня 1932 г.

## Бібліяграфічныя спасылкі


1. История внешней политики СССР. 1917–1975. Т. 1: 1917–1945. М., 1976.
2. *Кен О. Н.*, *Рупасов А. И.* Политбюро ЦК ВКП(б) и отношения СССР с западными соседними государствами (конец 1920–1930-х гг.). Проблемы, документы, опыт комментария: в 2 ч. Ч. 1: декабрь 1928 г.–июнь 1934 г. Санкт-Петербург, 2000.
3. *Мезга Н. Н.* Западная Беларусь в советско-польских отношениях: от Рижского договора до воссоединения с БССР // Журнал Белорусского государственного университета. История. 2019. № 4. С. 17–20.
4. СССР в борьбе за мир накануне второй мировой войны (сент. 1938–август 1939 гг.): док. и материалы / М-во иностранных дел СССР. М.: Политиздат, 1971.
5. *Лазько Р. Р.* Перад патопам (Еўрапейская палітыка Польшчы. 1932–1939 гг.). Мінск: БДУ, 2000.
6. Знешняя палітыка Беларусі: Зборнік дакументаў і матэрыялаў. Т. 3: 1928–1941 гг. / склад. У. М. Міхнюк, У. К. Ракашэвіч, Я. С. Фалей, А. В. Шарапа. Мінск, 1999.